# С Т Э Н А Г Р А М А

паседжання Прэзідыума Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР

8 студзеня 1958 года

ПРЫСУТНІЧАЛІ: Члены Прэзідыума: П.Броўка, І.Шамякін, К.Крапіва, М.Лынькоў, М.Лужанін, В.Витка, М.Танк, П.Кавалёў, І.Гурскі, М.Калачынскі , сакратар партарганізацыі Я.Васілёнак, пісьменнікі.

БРОЎКА. Сёння мы павінны абмеркаваць наступныя пытанні: аб плане работы Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР на бліжэйшыя месяцы - студзень, люты і сакавік. Мы ўносім на ваша абмеркаванне такія прапановы.

Паседжанне Прэзідыума правесці І5 студзеня, на якім абмеркаваць пытанні: І. аб удзеле пісьменнікаў у падрыхтоўцы да 40-годдзя Совецкай Арміі /І.Мележ/. 2. Аб выніках творчага году і выбарах бюро творчых секцый, і 3. Уручэнне членскіх білетаў. Я думаю, што мы ў асноўным уручым членскія білеты сёння, а астатнім пісьменнікам будзем уручаць І5 студзеня.

Наступнае паседжанне Прэзідыума адбудзецца 29 студзеня , на якім будуць абмеркаваны пытанні: І. Паэзія ў часопісе "Полымя". Даручаецца падрыхтаваць гэта пытанне А.Звонаку. 2.Аб падрыхтоўцы да 40-годдзя БССР. Гэта пытанне даручаецца мне.

На паседжанні Прэзідыума І2 лютага будзе стаяць пытанне аб рабоце часопіса "Маладосць", аб выхаванні літаратурнай моладзі. Гэта пытанне даручаецца падрыхтаваць тав. М.Хведаровічу. На гэтым-жа паседжанні пытанне аб ходзе падрыхтоўкі да Тыдня літоўскай літаратуры на Беларусі /М.Калачынскі/.

Далей, правесці паседжанне Прэзідыума 26 лютага: І. Аб перакладах з братніх літаратур на беларускую мову. /М.Лужанін, Я.Сяміжонаў/, 2. аб рабоце бюро прапаганды /А.Есакоў і Ю.Багушэвіч/.

Паседжанне Прэзідыума І9 сакавіка: І. Аб нарысах па гісторы

БРОЎКА. Наступнае пытанне - аб прыёме ў члены Саюза пісьменнікаў. У нас ужо вельмі даўно катыруецца кандыдатура Міхася Скрыпкі. Зараз секцыя паэзіі абмеркавала гэта пытанне і выказала аднадушную думку, каб прыняць яго ў члены саюза пісьменнікаў БССР. Слова мае М.Хведаровіч.

ХВЕДАРОВІЧ. На секцыі паэзіі разглядаліся творы М.Скрыпкі. Я зрабіў кароткі агляд яго творчасці і многія таварышы, як А.Звонак і В.Корбан выказалі думку аб тым, што трэба яго рэкамендаваць у члены саюза.

М.Скрыпка пачаў друкавацца ў 1927 годзе. Ён піша сатырычныя вершы, апавяданні, пароды, байкі, друкуецца ў нашых часопісах "Полымя", "Маладосць", "Вожыку", Яго сатырычныя апавяданні былі надрукаваны ў [illegible] газетах, за што ён атрымаў ад "Звязды", "Мінскай праўды" і "Советской Белоруссии" прэмію.

Многа я гаварыць не буду, бо вы ўсе ведаеце М.Скрыпку. Рэкамендацыі яму далі В.Корбан, Я.Герцовіч і С.Дзергай, а таксама секцыя паэзіі.

/М.Хведаровіч зачытвае анкетныя даныя на М.Скрыпку/

Асобных зборнікаў у яго няма, але зараз ён падрыхтаваў зборнік, які ўключан у план і павінен быць апублікаваны ў 1958 годзе.

БРОЎКА. Якія пытанні будуць да тав. Скрыпкі? Калі няма, тады прашу галасаваць. Галасуюць члены праўлення Саюза пісьменнікаў. Хто за тое, каб прыняць М.Скрыпку ў члены саюза, прашу галасаваць. Хто супроць, хто ўстрымаўся? Няма. Давайце прагаласуем усе. Хто за тое, каб прыняць М.Скрыпку ў члены саюза пісьменнікаў, прашу галасаваць. Прашу апусціць. Хто супроць, хто ўстрымаўся?

Скрыпка Міхаіл Александровіч прымаецца аднагалосна.

/Апладысменты/.

СКРЫГАН. Мы некалькі разоў гаварылі аб наладжванні культурных сувязей з Украінай, але забылі аб гэтым. Я думаю, што трэба дару-